© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

УВАГА! *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.*

Дэманстрацыйны варыянт экзаменацыйнай (тэставай) работы
Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі

Варыянт змяшчае 38 *заданняў і складаецца з часткі* А *(*16 *заданняў) і часткі* В *(*22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

Частка А

У кожным заданні часткі А *толькі адзін з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

А1. У перыяд неаліту (новага каменнага веку) на беларускіх землях:
1) узніклі першыя гарады;
2) выкарыстоўваліся медныя і бронзавыя прылады працы;
3) з'явілася земляробства;
4) склалася этнаплемянная супольнасць людзей – балтаў;
5) адбываўся пераход ад суседскай абшчыны да радавой.

А2. Хрышчэнне Старажытнай Русі ў 988 г. правёў:
1) князь Ізяслаў;
2) князь Уладзімір Святаславіч;
3) канстанцінопальскі патрыярх;
4) Клімент Смаляціч;
5) Кірыла Тураўскі.

А3. Адзначце падзею, якая адбылася ў 1237 г.:
1) абарона горада-крэпасці Кукенойс;
2) разгром шведскіх рыцараў на р. Няве;
3) разгром крыжакоў на Чудскім возеры;
4) пачатак мангольскага нашэсця на землі Старажытнай Русі;
5) паход на полаўцаў князя Ігара Святаславіча.

А4. Прывілей Казіміра Ягайлавіча 1447 г.:
1) надаў феадалам права вотчыннага суда над сваімі падданымі;
2) завяршыў працэс запрыгоньвання сялян;
3) ураўняў у правах праваслаўную і каталіцкую шляхту;
4) надаў праваслаўнай царкве перавагу над каталіцкай;
5) забараніў пераходы з адной канфесіі ў іншую.

А5. Старажытнае свята Камаедзіца ў жыхароў беларускіх зямель звязана са (з):
1) звычаем памінання памерлых;
2) днём летняга сонцастаяння;
3) праводзінамі адыходзячага года;
4) заканчэннем жніва;
5) надыходам вясны.


А6. Хрысціяне-некаталікі ў Рэчы Паспалітай атрымалі назву:
1) дысідэнты;
2) арыяне;
3) гугеноты;
4) езуіты;
5) філарэты.

А7. Вызначце правільнае сцверджанне адносна канфесійнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст.

1) Берасцейская царкоўная унія была заключана ў 1569 г.
2) Галоўным тэарэтыкам царкоўнай уніі быў езуіт Спірыдон Собаль.
3) Працэсы Рэфармацыі і Контррэфармацыі аказалі станоўчы ўплыў на стан праваслаўнай царквы.
4) Рэлігійная палітыка Рэчы Паспалітай пераважна была накіравана на ўзмацненне ўплыву каталіцкай царквы і аб'яднанне вакол яе ўсяго грамадства.
5) У 1587 г. у Вільні было заснавана каталіцкае брацтва.

А8. Тэрыторыя, заштрыхаваная на картасхеме, увайшла ў склад Расійскай імперыі паводле:

1) дагавора 1793 г. паміж Прусіяй і Расіяй;
2) дагавора 1795 г. паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй;
3) рашэння Чатырохгадовага («Вялікага») сойма;
4) дагавора 1772 г. паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй;
5) рашэння Венскага кангрэса.



А9. Адным з мерапрыемстваў расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. было ўвядзенне:

1) дэмакратычных свабод;
2) магдэбургскага права;
3) рэкруцкай павіннасці;
4) дадатковых прывілеяў шляхты;
5) Канстытуцыі 1791 г.

А10. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. быў падпісаны расійскім імператарам:

1) Аляксандрам I;
2) Аляксандрам II;
3) Аляксандрам III;
4) Мікалаем I;
5) Мікалаем II.

А11. Вызначце правільнае сцверджанне адносна падзей Першай сусветнай вайны.

1) На акупаванай тэрыторыі Беларусі рэальнай уладай валодалі германскія каменданты, граданачальнікі, начальнікі паветаў.
2) У сакавіку 1917 г. у Брэст-Літоўске быў заключаны мір паміж Германіяй і Савецкай Расіяй.
3) Германія капітулявала 11 лістапада 1917 г.
4) У Першай сусветнай вайне ўдзельнічалі не больш за 28 дзяржаў.
5) ЗША ўступілі ў Першую сусветную вайну ў 1917 г. на баку Траістага саюза.

А12. Устанавіце адпаведнасць.

Эканамічная палітыка	Мерапрыемствы
1) «ваенны камунізм» 2) новая эканамічная палітыка (НЭП)	а) частковая прыватызацыя сярэдніх і дробных прадпрыемстваў б) увядзенне прамога прадуктаабмену паміж горадам і вёскай в) нацыяналізацыя прамысловасці г) замена харчразвёрсткі харчпадаткам д) натуралізацыя і ўраўняльнасць у зарплаце е) правядзенне грашовай рэформы

1) 1авг; 2бде; 2) 1бде; 2авг; 3) 1аге; 2бвд; 4) 1вгд; 2абе; 5) 1бвд; 2аге.

А13. З 28 лістапада па 1 снежня 1943 г. праходзіла сустрэча кіраўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі ў фармаце міжнароднай канферэнцыі ў:

1) Маскве; 3) Вашынгтоне; 5) Ялце.
2) Тэгеране; 4) Патсдаме;

А14. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. характарызавалася:

1) адраджэннем калектыўных метадаў кіравання;
2) прыняццем курсу на перабудову савецкай палітычнай сістэмы;
3) узмацненнем палітычных рэпрэсій;
4) пашырэннем дэмакратычных свабод слова і друку;
5) ростам партыйнага і дзяржаўнага апарату.

А15. Тэрмін «каляровая рэвалюцыя» атрымаў распаўсюджванне пасля падзей у (ва):

1) Сірыі; 2) Украіне; 3) Югаславіі; 4) Тунісе; 5) Іране.

А16. Рэзалюцыя аб правядзенні канстытуцыйнай рэформы ў Рэспубліцы Беларусь была прынята на VI Усебеларускім народным сходзе ў:

1) 2006 г.; 2) 2010 г.; 3) 2016 г.; 4) 2021 г.; 5) 2024 г.

Частка В

Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі В*, запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, пазначаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

В1. Вызначце правільныя сцверджанні адносна развіцця Беларусі ў дадзяржаўны перыяд.

1) Славяне з’явіліся на тэрыторыі Беларусі больш за 100 тыс. гадоў таму.
2) Апошні ледавік адступіў з тэрыторыі Беларусі 35 тыс. гадоў таму.
3) Верагодна, першымі людзьмі, якія прыйшлі на тэрыторыю Беларусі, былі неандэртальцы.
4) Поўнасцю беларускія землі былі заселены ў перыяд мезаліту (сярэдняга каменнага веку).
5) Ствараліся шахты для здабычы крэменю.

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **123.**

В2. Устанавіце паслядоўнасць прыходу да ўлады.

1) Усяслаў Брачыславіч, полацкі князь;
2) Отан I, імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі;
3) Юрый Яраславіч, тураўскі князь;
4) Карл Вялікі, імператар Франкскай імперыі;
5) Яраслаў Уладзіміравіч, кіеўскі князь.

Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад: **12345.**

В3. У X–XIII стст. на беларускіх землях людзі, якія трапілі ў залежнасць з-за таго, што ўзялі пазыку, якую павінны былі адпрацоўваць у гаспадарцы пана, пакуль не вернуць доўг, – гэта _____.

Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.

В4. Вызначце прычыны ўтварэння ВКЛ:

1) распаўсюджванне хрысціянства;
2) адсутнасць падтрымкі мясцовых князёў з боку мясцовага славянскага насельніцтва;
3) знешняя небяспека з боку нямецкіх рыцараў;
4) імкненне Маскоўскага княства падпарадкаваць беларускія землі;
5) аб'яднанне літоўскіх плямён пад уладай ваенных правадыроў (князёў).

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **12.**

В5. Устанавіце адпаведнасць.

Гістарычная падзея	Дата
А) падзенне Канстанцінопаля	1) 1265 г.
Б) прыняцце Судзебніка Казіміра	2) 1362 г.
В) бітва на р. Сінія Воды	3) 1439 г.
Г) падпісанне Фларэнтыйскай уніі	4) 1453 г.
	5) 1468 г.

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад: **А1Б4В3Г5.**

В6. У Заходняй Еўропе прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і выкарыстанні ручной працы наёмных рабочых, – гэта _____.

Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.

В7. Вызначце правільныя сцверджанні адносна палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця цывілізацый свету ў XVI–XVIII стст.

1) У Заходняй Еўропе ў XVII–XVIII стст. асноўнай формай праўлення стаў абсалютызм.
2) Першай буржуазнай рэвалюцыяй стала Англійская рэвалюцыя.
3) Вестфальскі мір ураўнаваў у правах каталікоў і пратэстантаў.
4) Брытанская каланіяльная імперыя валодала найбольшай колькасцю тэрыторый.
5) У краінах Усходу фарміраваўся капіталізм.

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **123.**

В8. Віленская езуіцкая акадэмія была адкрыта ў _____ годзе.

Адказ запішыце ў выглядзе ліку. Напрыклад: **1900.**

В9. Вызначце характэрныя рысы палітычнага развіцця Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – XVIII ст.:

1) спыненне барацьбы магнацкіх груповак за ўладу;
2) значнае пашырэнне кампетэнцый Рады ВКЛ;
3) умяшанне замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы;
4) адстойванне дзяржаўных інтарэсаў ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай;
5) фарміраванне магнацкай алігархіі.


Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **123.**

В10. Устанавіце паслядоўнасць падзей.

1) Пачатак аграрнай рэформы А. Тызенгаўза;
2) Полацкі царкоўны сабор;
3) заканчэнне Нідэрландскай буржуазнай рэвалюцыі;
4) бітва пад Вількамірам;
5) Варфаламееўская ноч у Францыі.

Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад: **12345.**

В11. Вызначце правільныя сцверджанні, выкарыстоўваючы картасхему «Развіццё сеткі чыгунак у Беларусі».



1) Першай чыгункай была Пецярбургска-Варшаўская дарога.
2) Рух па Лібава-Роменскай чыгунцы пачаўся ў 1871 г.
3) Маскоўска-Брэсцкая чыгунка злучыла Баранавічы і Мінск.
4) Будаўніцтва чыгунак поўнасцю завяршылася да канца XIX ст.
5) Палескія чыгункі праходзілі выключна па тэрыторыі, якая знаходзіцца ў граніцах сучаснай Рэспублікі Беларусь.

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **12.**

В12. Устанавіце *адзіна правільную* адпаведнасць.

Рэформа	Характэрная рыса
А) аграрная рэформа 1861 г. Б) рэформа П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы В) сталыпінская аграрная рэформа	1) увядзенне абавязковых дакументаў, якія ўключалі апісанне памераў сялянскіх надзелаў і павіннасцей 2) увядзенне мяжы яўрэйскай аселасці 3) падзел усіх сялян у залежнасці ад памераў іх зямельных надзелаў на чатыры разрады 4) стварэнне фальваркаў і замацаванне за імі сялян

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літары і лічбы. Напрыклад: **А1.**

В13. Устанавіце адпаведнасць.

Вучоны	Уклад у развіццё беларусазнаўства
А) К. Калайдовіч Б) Е. Раманаў В) В. Ластоўскі Г) Я. Карскі	1) выдаў першы абагульняльны нарыс «Кароткая гісторыя Беларусі» 2) у артыкуле «Аб беларускай гаворцы» падкрэсліў адрозненне беларускай мовы ад іншых славянскіх моў 3) аўтар-укладальнік першага фундаментальнага «Слоўніка беларускай гаворкі» 4) аўтар фундаментальнага даследавання «Беларусы», у якім навукова абгрунтаваў наяўнасць этнічнай самасвядомасці беларусаў 5) падрыхтаваў 15-томнае выданне «Беларускі зборнік», якое змяшчае надзвычай багаты матэрыял пра народную культуру беларусаў

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад: **А1Б4В3Г5.**

В14. Вызначце правільныя сцверджанні адносна нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў 1918–1921 гг.

1) Беларускую Камуністычную арганізацыю (БКА) падчас польска-савецкай вайны ўзначальваў А. Р. Чарвякоў.
2) 31 студзеня 1918 г. быў створаны Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам).
3) Рыжскі мірны дагавор быў падпісаны ў сакавіку 1918 г.
4) Рух за нацыянальнае самавызначэнне ўзмацніўся пасля вызвалення Беларусі ад германскіх войскаў і аднаўлення Савецкай улады.
5) Летам 1919 г. Літоўска-Беларуская Рэспубліка спыніла сваё існаванне.

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **123.**

В15. Адзначце *год* падзеі, якая адбылася *першай* сярод пералічаных:

1) абвяшчэнне Турцыі рэспублікай;
2) утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ);
3) стварэнне суполкі «Гоман»;
4) заснаванне Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта);
5) абвяшчэнне Германскай імперыі.

***Адказ запішыце ў выглядзе ліку. Напрыклад:* 1900.**

В16. Вызначце правільныя сцверджанні адносна падзей Вялікай Айчыннай вайны.

1) Карэнны пералом у Вялікай Айчыннай вайне быў замацаваны ў бітве пад Масквой.
2) У ліпені 1944 г. у Маскве адбыўся «Парад пераможаных».
3) На акупаванай нацыстамі тэрыторыі СССР быў усталяваны «новы парадак».
4) Захопнікі рассялілі да 10 тыс. асаднікаў на акупаванай беларускай тэрыторыі.
5) Абарона Магілёва працягвалася з 3 па 26 ліпеня 1941 г.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

В17. Устаўце ў прыведзеным тэксце на месцы пропускаў словы з прапанаванага спіска, якія падыходзяць па сэнсе. Выбірайце словы паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх у патрэбнай форме.

У чэрвені 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Для наступлення прыцягваліся войскі франтоў: 1-га Беларускага – камандуючы **А)** _____; 2-га Беларускага – камандуючы **Б)** _____; 3-га Беларускага – камандуючы **В)** _____; 1-га Прыбалтыйскага – камандуючы І. Х. Баграмян

1) П. К. Панамарэнка	**3)** А. М. Васілеўскі	**5)** Г. К. Жукаў
2) І. Д. Чарняхоўскі	**4)** К. К. Ракасоўскі	**6)** Г. Ф. Захараў

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар верхняга рада. Памятайце, што некаторыя даныя ніжняга рада могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б6В3.**

В18. Устанавіце адпаведнасць.

Гістарычная падзея	Дата
А) стварэнне Арганізацыі Варшаўскага дагавора (АВД)	1) 1921 г.
Б) заснаванне Таварыства Беларускай школы (ТБШ)	2) 1926 г.
В) вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь	3) 1939 г.
Г) падпісанне дэлегацыяй БССР Статута ААН	4) 1945 г.
	5) 1955 г.

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**

В19. На мяжы 1950–1960-х гг. у савецкім выяўленчым мастацтве пачынае фарміравацца кірунак, які атрымаў назву «_____ стыль» і для якога былі ўласцівыя асэнсаванне трагедыі Вялікай Айчыннай вайны, гераізацыя подзвігу і працоўных будняў.

Дапоўніце інфармацыю. Адказ запішыце словам у той форме, у якой яно павінна быць прыведзена ў сказе.

В20. Вызначце правільныя сцверджанні адносна эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.

1) Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця вызначае прыярытэты развіцця рэспублікі на бліжэйшыя чатыры гады.
2) Адной з асаблівасцей беларускай мадэлі эканамічнага развіцця з'яўляецца аднавектарнасць знешнеэканамічнай палітыкі.
3) Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця замацавана рашэннямі Усебеларускіх народных сходаў.
4) Найважнейшай адметнасцю беларускай эканомікі з'яўляецца яе сацыяльная арыентацыя.
5) Беларусь першая сярод краін СНД ажыццявіла поўны пераход на лічбавае эфірнае вяшчанне.

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **123.**

В21. Усебеларускі народны сход:

1) забяспечвае суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы;
2) зацвярджае асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі;
3) зацвярджае канцэпцыю нацыянальнай бяспекі;
4) аналізуе работу мясцовых Саветаў дэпутатаў;
5) устанаўлівае дзяржаўныя святы і святочныя дні.

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: **123.**

В22. Устанавіце адпаведнасць.

Гістарычная падзея	Дата
А) падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі	1) 1986 г. 2) 1990 г.
Б) аварыя на Чарнобыльскай АЭС	3) 1999 г.
В) прыняцце Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»	4) 2010 г. 5) 2024 г.
Г) Рэспубліка Беларусь афіцыйна стала краінай – партнёрам БРІКС	

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад: **А1Б4В3Г5.**